
ШАКАЛАДНЫ РАЙ 6


ВЫПРАБАВАННІ АДАМА БАГДАНОВІЧА 8



5 КРАСАВІКА 2022 г.
АЎТОРАК
№ 65 (29687)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА


3 першых вуснаў

## «ЧАС ПРЫЙШОЎ, КАБ ВЫРАШАЦЬ ГЭТЫЯ ПЫТАННІ»

**Міністр сувязі і інфарматызацыі і старшыня Прэзідыума НАН расказалі Прэзідэнту Беларусі, як ідзе стварэнне профільнага дзяржаўнага органа ў сферы лічбавага развіцця і інфарматызацыі.**


Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка ўчора прыняў з дакладам Канстанціна Шульгана і Уладзіміра Гусакова. Як адзначыў кіраўнік краіны, сутнасць праблемы заключаецца ў тым, што стварэнне органа дзяржаўнага кіравання ў сферы лічбавага развіцця і пытаннях інфарматызацыі Беларусі адклалі на час, каб прынятае рашэнне было больш узважаным і глыбокім.

«У нас ёсць адпаведнае міністэрства, і гаворка ідзе не проста аб перайменаванні, а аб стварэнні новага органа на базе гэтага міністэрства. Тады было пастаўлена пытанне, ці неабходна тое рабіць і што гэта дасць, калі мы, пераймяноўваючы і ўдасканальваючы дзеючую структуру, надзелім яе дадатковымі паўнамоцтвамі? Ці нельга гэта зрабіць у рамках існуючай нарматыўна-прававой базы і існуючага органа кіравання — Міністэрства сувязі і інфарматызацыі? Ці неабходная гэта ломка?» — нагадаў палажэнні мінулай размовы Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў краіне разгортваецца дзяржпраграма «Лічбавае развіццё Беларусі», ды і ў праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку існуе цэлы блок, прысвечаны інфарматызацыі.

«Я заўсёды асцерагаюся, каб мы не пабеглі наперадзе цягніка і, каб дагадзіць модзе, не рабілі нейкія крокі. Модная цяпер лічбавізацыя. Часам многія не разумеюць, што такое лічбавізацыя, але тым не менш — гэта модна. Але мы не павінны адстаць», — заявіў Прэзідэнт.

Ад дакладчыкаў ён хацеў канчаткова пачуць усе «за» і «супраць» стварэння новага органа дзяржаўнага кіравання ў сферы лічбавага развіцця, так званага Мінлічбы.

«Я Акадэмію навук падключыў, каб пачуць альтэрнатыўны пункт гледжання. Вучоныя ёсць вучоныя. Яны дакладна бачаць і разумеюць, што творыцца ў гэтай сферы ў краіне. Не дай Бог, каб мы прынялі няправільнае рашэнне — сёння не да таго. А калі гэта дасць пэўны эфект, будзем займацца гэтым пытаннем», — дадаў Прэзідэнт.

Дакладваючы кіраўніку дзяржавы на сустрэчы, Уладзімір Гусакоў адзначыў, што рашэнне вельмі сур'ёзнае, бо мае пад сабой пераход на «лічбу» ўсіх сфер дзяржаўнага кіравання, эканомікі і грамадства. Ён заявіў, што не бачыць неадкладнай неабходнасці ў перабудоўванні міністэрства.

«Мэтавыя функцыі старога міністэрства сувязі і інфарматызацыі і меркаванага новага міністэрства лічбавага развіцця і сувязі (як гэтае ідзе з назвы) прыкладна аднолькавыя. Дзеючая назва нават больш ёмістая і мае больш шырокі ахоп сфер кампетэнцыі», — заўважыў навуковец.

Уладзімір Гусакоў пералічыў, што інфарматызацыя як паняцце ўключае лічбавае развіццё, рабатызацыю, захаванне, апрацоўку і перадачу даных, штучны інтэлект.

СТАР. 2

# А на Нёмане — вясна!


Фота БелТА.

Нягледзячы на надвор'е, якое пакуль зусім не спрыяе навігацыі, на Аўгустоўскім канале ў мінулыя выхадныя адкрыўся новы сезон. Там прайшоў міжнародны фестываль воднага турызму «Нёманская вясна», у якім спаборнічала каля 200 спартсменаў з Беларусі, Расіі, Узбекістана, Туркменістана і Ізраіля. Заплыў па халоднай вадзе канала быў у абавязковай праграме конкурснага мнагабор'я.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Мы павялічылі плошчу ворыва сёлета. Калі дазволіць надвор'е, трэба выйсці на 9 млн тон збожжа. Таксама трэба сабраць 5 млн тон цукровых буракоў. Цяпер цукар, як паказваюць сусветныя рынкі, гэта «другое золата». Акрамя таго, трэба павялічыць збор насення рапсу. Таксама неабходна дабіцца павышэння ўдояў малака, прыбаўлення ў вазе жывёлы, каб краіна была з хлебам, мясам і малаком. Гэтым разам у краіне пасадзілі больш азімых культур. Трэба вырабляць больш уласнага бялку для кармлення жывёлы з прычыны перабояў з пастаўкамі шротаў з-за мяжы».*

Сітуацыя

## Доля ў непабудаваным доме

**У Гомелі пацярпелыя ад нядобрасумленнага забудоўшчыка дольшчыкі сталі адрасатамі беспрэцэдэнтнага для рэгіёна вырашэння: для абароны іх інтарэсаў падрыхтаваны праект Указа Прэзідэнта Беларусі, які прадугледжвае будаўніцтва да канца 2025 года дома і першачарговае права атрымання кватэр у ім. Дакумент знаходзіцца ў стадыі ўзгаднення. Адказнасць за яго рэалізацыю гатовае ўзяць на сябе кіраўніцтва Гомельскага аблвыканкама.**


Участак у цэнтры, дзе павінны былі пабудаваць дом.

### Ці то аблігацыі, ці то махінацыя

У 2015 годзе прыватная кампанія-забудоўшчык «ЦэнтрЛізінг» прадала жыллёвыя аблігацыі на ўзвядзенне дзесяціпавярховіка з падземным паркінгам у самым цэнтры Гомеля. Але больш за 30 дольшчыкаў — уладальнікаў гэтых самых аблігацый (адна аблігацыя — адзін квадратны метр) засталіся і без кватэр, і без грошай. Нягледзячы на зрывы тэрмінаў будаўніцтва іх дома, людзі да апошняга спадзяваліся, што забудоўшчык выканае абавязацельствы. Кампанія пабудавала адзін з запланаваных дамоў, а другі так і не пачала.

Забудоўшчык не вырашыў пытанне з уладальнікамі прыватнай забудовы, на месцы якой планавалася будаўніцтва новага дома. На гэты час змянілася і заканадаўства аб выдзяленні зямельных участкаў пад шматпавярховую будоўлю. Сітуацыя аказалася невырашальнай.

Калі дольшчыкі пачалі настойваць на вяртанні грошай, укладзеных у аблігацыі, уласнік кампаніі ўцёк. Ашуканыя гамяльчане звярнуліся ў сілавыя органы. Кіраўнік фірмы быў затрыманы ўлетку 2017 года. На этапе папярэдняга расследавання сума ўрону ацэньвалася ў 1,8 мільёна рублёў. Судовае следства доўжылася больш за дзесяць месяцаў.

СТАР. 2

Будзьце здаровыя!

## ЖЫВАЯ ВАДА

### Беларускія санаторна-курортныя ўстановы будуць развіваць кірунак спа-паслуг

**Набліжаецца доўгачаканая пара адпачынкаў. Чым запоўніць яе, каб набрацца сіл, кожны вырашае сам. Хтосьці не ўяўляе адпачынак без паездкі да мора, іншыя выкарыстоўваюць вольны час на аздараўленне бліжэй да дома. Тым больш што пандэмія, змяніўшы наша стаўленне да свайго здароўя, вымусіла кожнага стаць больш адказным у гэтым пытанні.**



### Бязмежныя магчымасці

Заставацца здаровым прасцей, зручней і танней, чым «аднаўляць здароўе», ужо захварэўшы: сёння людзі з розным узроўнем дастатку гатовыя ўкладваць час і сродкі ў аздараўленне арганізма. Спецыялісты сферы лячэбна-аздараўленчага турызму звязваюць з гэтым узрослы попыт на спа-паслугі ў санаторыях Беларусі.

— Гэта сапраўды вельмі запатрабаваны кірунак у краіне, практычна ўсе санаторыі сёння прапаноўваюць гэты від паслуг, — адзначае дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь Балбатоўскі. — У нас ужо функцыянуе 10 спа-цэнтраў і каля 20 аддзяленняў у санаторна-курортных арганізацыях.

Асноўны від дзейнасці санаторна-курортных устаноў — медыцынскія паслугі, але ў апошнія гады неад'емнай часткай іх работы стала аздараўленне — паляпшэнне функцыянальных магчымасцяў арганізма без выкарыстання медыцынскіх метадаў, падкрэсліў суразмоўнік. Менавіта таму сёння здраўніцы павінны пазіцыянаваць сябе не проста як медыцынскія ўстановы: адпачывальнікам патрэбны аздараўленчыя комплексы, якія даюць магчымасць для адпачынку і аздараўлення і задаюць высокую планку сэрвісу. І такія ўстановы ў нашай краіне ёсць. Тым больш што развіццё менавіта спа-кірунку для Беларусі арганічна.

— Што датычыцца асаблівасцяў Беларусі, то магчымасці, па сутнасці, бязмежныя, — лічыць Генадзь Балбатоўскі. — Бо ў спа-працэдурах выкарыстоўваюцца гаючыя ўласцівасці вады. А тут патэнцыял менавіта ў Беларусі вельмі вялікі. На тэрыторыі здраўніц у нас выкарыстоўваюць больш за 90 свідравін з мінеральнай вадой.

СТАР. 2

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Орбан і Вучыч перамаглі на выбарах



Віктар Орбан заявіў аб перамозе сваёй партыі «Фідэс — Венгерскі грамадзянскі саюз» на парламенцкіх выбарах, якія адбыліся ў нядзелю ў Венгрыі, паведаміла ТАСС. Нацыянальнае выбарчае бюро праінфармавала пасля апрацоўкі 96 % бюлетэняў, што Фідэс і іх саюзнікі — хрысціянскія дэмакраты — атрымліваюць па партыйных спісах 53 % галасоў і бяруць верх над палітычнымі сапернікамі ў 88 аднамандатных акругах. Дзякуючы гэтаму яны могуць разлічваць на 135 са 199 дэпутацкіх месцаў у Дзяржаўным сходзе (аднапалатным парламенце) краіны. Яны захаваюць і канстытуцыйную большасць у дзве трэці галасоў у парламенце. Цяпер Орбан застанецца на пасадзе прэм'ера яшчэ на працягу чатырох гадоў. Ён узначальвае ўрад Венгрыі ўжо тры тэрміны запар, пачынаючы з 2010-га.

Аляксандр Вучыч аб'явіў аб перамозе на прэзідэнцкіх выбарах у Сербіі ў першым туры, паведаміла ТАСС. «Па нашых даных, я набраў ад 59,8 да 60,1 %, — распавёў ён на прэс-канферэнцыі ў штабе Сербскай прагрэсіўнай партыі. — Мне ўдалося зрабіць тое, што ніколі нікому не ўдавалася зрабіць у Сербіі. Я адзіны, хто двойчы перамог у першым туры». Паводле слоў Аляксандра Вучыча, Сербская прагрэсіўная партыя і іх кааліцыйны партнёр — Саюз ваяводзінскіх венграў — атрымліваюць дастаткова галасоў для фарміравання парламенцкай большасці.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Віктара Орбана і Аляксандра Вучыча з іх перамогай на выбарах.**

ISSN 1990 - 763X

### Найбуйнейшы з 1950-х гадоў спад узроўню жыцця зафіксавалі ў Вялікабрытаніі

З-за павышэння тарыфаў на электрычнасць многія жыхары Вялікабрытаніі задаюцца пытаннем, як выжываць далей. Пра гэта паведаміла The Independent.

Рахункі на электраэнергію для некаторых спажыўцоў з 1 красавіка выраслі амаль удвая. Для пяці мільёнаў хатніх гаспадарак выдаткі на электрычнасць будуць складаць ад 10 % бюджэту. Таксама брытанскія ўлады павысілі ПДВ да 20 працэнтаў і збіраюцца ў красавіку павялічыць муніцыпальны падатак і ўзносы за сацстрахаванне. У буйных гарадах Вялікабрытаніі адбыліся акцыі пратэсту ў сувязі з ростам цэн на электраэнергію, паведаміла The Guardian. Паводле інфармацыі выдання, усяго на вуліцы выйшла некалькі тысяч пратэстоўцаў. У Лондане дэманстранты заклікалі членаў урада падаць у адстаўку ў сувязі з рэзкім павелічэннем кошту жыцця.

### У Пакістане распусцілі парламент

Прэзідэнт Пакістана Арыф Алві распусціў Нацыянальны сход (ніжнюю палату парламента) па прапанове прэм'ер-міністра Імрана Хана. Аб гэтым паведаміў пакістанскі тэлеканал Geo.tv. Інфармацыю аб роспуску палаты таксама пацвердзіў спецыяльны памочнік прэм'ер-міністра Шахбаз Гіл. «Нацыянальны сход распушчаны», — напісаў ён на сваёй старонцы ў Twitter, дадаўшы, што цяпер пакістанскі народ вырашыць лёс прэм'ер-міністра. Гэта адбылося пасля таго, як апазіцыя ініцыявала спробу аб'явіць вотум недаверу прэм'еру, абвінавачваючы Хана, які прыйшоў да ўлады ў 2018 годзе, у няздольнасці палепшыць эканамічную сітуацыю ў краіне, а таксама ў карупцыі.

Падчас пасяджэнняў у ніжняй палаце парламента краіны віцэ-спікер Касім Суры заявіў, што правядзенне такога галасавання супярэчыла б канстытуцыі краіны, а таму не можа быць праведзена.

## КОРАТКА

- **У Беларусі вясной плануюць высадзіць больш за 28 тысяч гектараў лесу.**
- БДУ сёлета прыме на навучанне больш за 5 тысяч студэнтаў.
- **Новы праект Прэзідэнцкага спартыўнага клуба «Футбол для ўсіх!» стартаваў у Беларусі.**
- Стартаваў конкурс дзіцячага малюнка «Гісторыя майго краю ў гады Вялікай Айчыннай вайны», арганізаваны Узброенымі Сіламі Беларусі і прысвечаны Году гістарычнай памяці. Конкурс праходзіць у трох узроставых катэгорыях: 7—9 гадоў, 10—12 гадоў і 13—16 гадоў. Малюнкі можна даслаць па тэмах: «Ніхто не забыты і нішто не забыта», «Яны змагаліся за вызваленне Беларусі» і «Мой прадзед — гонар нашай сям'і».

Сяўба-2022

## З БЛАСЛАВЕННЕМ І СНЕГАМ

### У гаспадарцы Маларыцкага раёна разам з механізатарамі ў поле выйшаў святар


Фота Валерыя КАРАЛЯ.

**Масавую сяўбу на Брэстчыне распачалі больш за тыдзень таму. Спачатку ў поле выйшлі агрэгаты паўднёвых раёнаў вобласці, а потым паступова ў работу ўключыліся аграрыі Ганцавіцкага, Ляхавіцкага, Баранавіцкага раёнаў. Планавалася, што сяўбу ранніх збожжавых і зернебабовых правядуць за два — два з паловай тыдні. Але прырода распарадзілася па-свойму. З першага красавіка палеткі завваліла снегам, з-за чаго здарыўся перапынак у рабоце сейбітаў.**

СТАР. 3

# «ЧАС ПРЫЙШОЎ, КАБ ВЫРАШАЦЬ ГЭТЫЯ ПЫТАННІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Іншымі словамі, вы хочаце сказаць, што новая назва і магчымы новы орган крыху звужаюць?» — запытаўся Прэзідэнт.

«Так. Новая назва, зразумела, гучыць больш сучасна, але нацэльвае на канкрэтную сферу — «лічбу», — канстатаваў Уладзімір Гусакоў.

### Прэзідэнт анансаваў нараду з айцішнікамі

На сустрэчы з міністрам сувязі і інфарматызацыі і старшынёй Прэзідыума НАН Аляксандр Лукашэнка заявіў аб неабходнасці нарады з рэзідэнтамі Парка высокіх тэхналогій.

Створаны своечасова Парк высокіх тэхналогій сыграў сваю ролю ў лічбавізацыі і сёння мае важнае значэнне, падкрэсліў беларускі лідар і папрасіў у Канстанціна Шульгана і Уладзіміра Гусакова далажыць, як ідуць там справы цяпер.

«Наколькі актуальная тэндэнцыя адтоку кадраў, як мяне інфармуюць? Там нібыта такі адток, што заўтра загіне Беларусь без айцішнікаў!» — сказаў Прэзідэнт.

Ён выказаў жаданне ў найбліжэйшы час прысвяціць нейкі дзень, каб правесці нараду з прадстаўнікамі IT-сферы, кампаніямі, што працуюць у ПВТ, і прыняць шэраг рашэнняў па тэме.

«Працэс ад'езду некаторых айцішнікаў назіраецца і, верагодна, ён немалы. Нам неабходна пагледзець з боку бяспекі, наколькі гэта небяспечна для Беларусі. З іншага погляду, неабходна разабрацца з IT-тэхналогіямі, IT-паркам і гэтымі айцішнікамі, каб у нас былі роўныя ўмовы для ўсіх. Час прыйшоў, каб вырашаць гэтыя пытанні», — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

**Канстанцін ШУЛЬГАН, міністр сувязі і інфарматызацыі,** пасля размовы адказаў на пытанні журналістаў, расклаўшы па палічках, аб чым гаварылася на нарадзе.

**— Наконт назвы.** «Калі ў фінальных развагах мы прыйдзем да таго, што функцыі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі ўключаюць лічбавае развіццё, то перайменавання не будзе», — сказаў кіраўнік ведамства.

**— Што ўключае Указ?** «Галоўнае, што змястоўна ўключана ва Указ і мяне радуе: функцыі, што ёсць, падтрыманы кіраўніком краіны. Яны даюць магчымасць «лічбу», інфарматызацыю развіваць, маштабаваць, каб атрымліваць эканамічны эфект», — падзяліўся спікер.

**— Парады Прэзідэнта.** «Ён прапанаваў нам вывучыць пазіцыю і ПВТ, і іншых суб'ектаў, якія ўключаны ў гэту работу. Яго пазіцыя: тыя, хто працуе, павінны несці адказнасць за вынік. І ад гэтай работы і па яе выніках нам даручана падрыхтаваць яшчэ адну нараду з удзелам ПВТ, дзе гэтыя пытанні будуць абмеркаваны», — дадаў Канстанцін Шульган.

**— Новыя функцыі Мінсувязі.** «Асноўная новая функцыя — каардынацыя дзяржаўнай палітыкі і яе распрацоўка. Кропкавыя праекты ўзнікаюць усюды, бо развіццё не спыніць. Але эканамічны эфект падыходзіць тады, калі гэтыя кропкавыя праекты аб'ядноўваюцца ў адзіную платформу, адзіны вынік. Гэта дае магчымасць ствараць прадукты і выкарыстоўваць іх незалежна ад таго, дзе тэрытарыяльна размешчана прадпрыемства, якія ў яго асаблівасці», — заявіў міністр.

**— «Вертыкаль» у лічбавізацыі.** «Гэта пабудова дзяржаўнай сістэмы кіравання лічбавымі праектамі. Што сюды ўваходзіць? Асобы ў іншых міністэрствах і ведамствах павінны адказваць за гэтыя працэсы. Без гэтага адно Міністэрства сувязі ніяк не ўкараніць праекты ў іншых галінах. Мусіць быць адказны чалавек, які гэтым займаецца. У яго павінны быць сілы, якія будуць дапамагаць прапрацоўваць эфектыўнасць праектаў, ставіць задачы праграмістам. Ва Указе прапанавана схема: калі ёсць штатнае падраздзяленне — добра. Яны выконваюць гэтыя функцыі. Калі іх няма, мы ствараем цэнтр лічбавага развіцця, які гэтую работу можа ўзяць на сябе», — расказаў Канстанцін Шульган.

# Доля ў непабудаваным доме

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сабраныя па справе доказы сведчылі аб тым, што бізнесмен заведама не меў намеру выконваць абавязацельствы па будаўніцтве другога шматпавярховіка, аблігацыі за які рэалізаваў. Да суда і падчас следства абвінавачаны цалкам ці часткова разлічыўся з некаторымі з пацярпелых. Між тым, суд прызнаў фактычнага кіраўніка кампаніі вінаватым у махлярстве і крадзяжы шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі. Яму было прызначана шэсць гадоў пазбаўлення волі.

### «Усё вырашальна»

На працягу амаль васьмі гадоў гамяльчане, якія так і не дачакаліся сваіх грошай за «аблігацыі-пустышкі», не пакідалі надзеі на вырашэнне іх сітуацыі. Людзі звярталіся па дапамогу ў самыя розныя інстанцыі. У лютым бягучага года адразу чатыры звароты ад былых дольшчыкаў «ЦэнтрЛізінгу» паступілі падчас прыёму грамадзян у Ельскім райвыканкаме, які праводзіў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Мікалай Рагашчук. Заяўнікі вырашылі чарговы раз нагадаць аб сітуацыі, з якой не дадуць рады выбрацца. Прывезлі з сабой адказы з інстанцый, публікацыі ў прэсе аб іх гісторыі.

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці запэўніў грамадзян, што тэрмінова правядзе па агучаным імі пытанні нараду з удзелам прадстаўнікоў усіх адказных ведамстваў і службаў. Мікалай Рагашчук звярнуў увагу і на тое, што ў краіне ўжо ёсць практыка вырашэння падобных складаных сітуацый.

— Думаю, разам выпрацуем прымальнае рашэнне. На дзяржаўным узроўні ёсць усё для гэтага. Усё вырашальна, — падкрэсліў падчас прыёму грамадзян у Ельску прадстаўнік кіраўніка дзяржавы.

### Не страціць будаўнічы сезон

На мінулым тыдні аб сутнасці падрыхтаванага праекта Указа Прэзідэнта па абароне інтарэсаў пацярпелых гамяльчан жыхары абласнога цэнтра з першых вуснаў даведаліся ад старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана Крупко. Кіраўнік рэгіёна правёў сустрэчу з былымі дольшчыкамі «ЦэнтрЛізінгу».

— Працэс ідзе амаль восем гадоў, і, безумоўна, усе зацікаўленыя ў тым, каб людзі атрымалі жыллё. Калі мы ўсе папрацуем для паскарэння вырашэння сітуацыі, то не страцім будаўнічы сезон бягучага года, — звярнуўся да прысутных губернатар.

Грамадзяне змаглі задаць пытанні прадстаўнікам будаўнічага комплексу рэгіёна, юрыстам і фінансістам. Галоўная просьба, якую аднагалосна агучылі ўсе былыя дольшчыкі, — растэрміноўка аплаты на пяць гадоў падчас будаўніцтва жылля.

Праект Указа дае першачарговае права на атрыманне жылля ў новым доме па сабекошце за метры, пацверджаныя аблігацыямі, якія не былі выкарыстаныя. Дакумент таксама прадугледжвае льготны рэжым і мінімізацыю затрат заказчыка на ўзвядзенне аб'екта, але не прадугледжвае выплату грашовай кампенсацыі і растэрміноўкі аплаты падчас будаўніцтва.



**У Гомелі падчас судовай справы над уласнікам кампаніі-забудоўшчыка.**

На сустрэчы некаторыя былыя ўдзельнікі долевага будаўніцтва падзяліліся, што нягледзячы на магчымасць ільготнага крэдытавання, другі раз укладваць грошы ў нерухомасць многім не пацягнуць фінансава. Так, гамяльчанка Зоя Новікава ў размове з журналістамі адзначыла, што вельмі ўдзячная за ўвагу і прадуманы падыход да сітуацыі з боку кіраўніцтва вобласці, за стаўленне да людзей. Але яна, напрыклад, цяпер на пенсіі і хвалюецца, што не зможа разлічваць на пазыкі пры будаўніцтве.

Іван Крупко даручыў адказным службам урэгуляваць адносіны паміж упраўленнем капітальнага будаўніцтва і забудоўшчыкамі па растэрміноўцы плацяжоў. Пры гэтым кіраўнік рэгіёна звярнуў увагу на неабходнасць атрымання прававой ацэнкі такіх дзеянняў з боку кантралюючых органаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ЖЫВАЯ ВАДА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спа — гэта метад фізіятэрапіі, звязаны з вадой. Тэрмін паходзіць ад назвы аднайменнага бельгійскага курорта, які набыў вядомасць дзякуючы сваім лячэбным водам. Ёсць і іншае значэнне тэрміна «спа» — «здароўе з вады», ад лацінскага выслоўя Sanitas per aquam. Сёння спа — сімвал клопату пра здароўе: многія гатэлі свету маюць уласныя спа-цэнтры.

— Калі ў шэрагу краін спа-паслугі аказваюцца з выкарыстаннем звычайнай вады, у нашых санаторыях паспяхова развіваюцца методыкі з выкарыстаннем менавіта мінеральнай вады — лячэбнай або лячэбна-сталовай, тут няма перашкод для развіцця і ўкаранення новых метадаў аздараўлення, — падкрэсліў Генадзь Мікалаевіч.

### Усім спа!

Спа-кірунак для нашай краіны малады: ён развіваецца ў беларускіх здраўніцах каля дзесяці гадоў. Далейшае ўдасканаленне спа-паслуг знаходзілася ў цэнтры ўвагі рабочай групы па развіцці лячэбна-аздараўленчага турызму Міжведамаснага савета па турызме пры Савеце Міністраў. Круглы стол адбыўся ў санаторыі «Юнацтва», дзе калісьці пачыналася развіццё айчыннага спа, а сёння функцыянуе спа-цэнтр еўрапейскага ўзроўню.

— У гэтага кірунку не такі ўжо вялікі стаж развіцця, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі. — За дзесяць гадоў немагчыма ўсё прывесці да эталона. «Юнацтва», мабыць, прыклад эталона, спа-цэнтр тут адпавядае міжнародным патрабаванням. У цэлым жа ў нас 105 устаноў санаторна-курортнага лячэння, і ўсе яны, за выключэннем студэнцкіх санаторыяў і прафілакторыяў, у тым ці іншым выглядзе аказваюць спа-паслугі. Але толькі трэцяя частка санаторна-курортных устаноў аказвае іх сапраўды на высокім узроўні. Таму сёння мы ставім перад сабой задачу вывесці гэтыя паслугі на такі ж высокі ўзровень, на якім аказваюцца ў беларускіх санаторыях паслугі лячэбныя.

Калі развіццё кірунку спа толькі пачыналася ў нашай краіне, ён быў арыентаваны на прыцягненне замежных грамадзян, адзначаюць спецыялісты. У Заходняй Еўропе гэты від адпачынку вельмі папулярны і даўно вядомы. Сёння цікавасць да спа-працэдур ёсць і ў нашых суайчыннікаў, кажуць яны.

### Здароўе ў прыярытэце

За апошнія гады сфера спа-паслуг атрымала сваё афармленне з пункту гледжання заканадаўства. Для яе функцыянавання неабходныя і досыць спецыфічнае абсталяванне, і кваліфікаваныя кадры. Спецыялісты распавялі, што практычна ўсе кадры ў сферы спа-паслуг у нашай краіне маюць медыцынскую адукацыю.

— Па сутнасці, у нас не задзейнічаны ў сферы аказання спа-паслуг людзі, у якіх няма медыцынскай адукацыі, як гэта бывае ў іншых краінах, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі.

Але ці ўсюды мэтазгодна развіваць кірунак? На думку эксперта, у першую чаргу далейшае развіццё спа-паслуг неабходна пры наяўнасці добрай матэрыяльна-тэхнічнай базы — гэта значыць, у санаторыях вышэйшай і першай катэгорый.

— Тым не менш мы бачым станоўчы вопыт аказання такіх паслуг і ў санаторыях больш нізкага цэнавага сегменту. Сёння санаторыі працуюць ва ўмовах свабоднага рынку, і калі б не было попыту, уласнікі не займаліся б развіццём гэтага кірунку.

Відавочна, што wellness і спа-праграмы запатрабаваны ў большай ступені ў людзей з дастаткова высокім узроўнем даходу. Хоць імкненне сачыць за сваім здароўем як адзін з прыярытэтаў назіраецца сёння ў грамадстве ў цэлым.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Судовая экспертыза

# РАСЛІННЫЯ, СІНТЭТЫЧНЫЯ, ПСІХАТРОПНЫЯ

## Пра асаблівасці выяўлення, ужывання і небяспекі наркатычных рэчываў расказалі спецыялісты

**Рэспубліканскі пералік наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў утрымлівае больш за 700 пазіцый. Згодна з міжнароднай практыкай, калі спецыялісты выяўляюць структуру рэчыва, якое можа з'яўляцца псіхатропным, або заўважаюць псіхатропны эфект матэрыялу, яго ўносяць у гэты спіс. Многія з пералічаных падкантрольных наркасродкаў амаль не сустракаюцца ў Беларусі, як, напрыклад, экзатычныя ліст шалфею вешчуноў, кветкі блакітнага лотаса, насенне ружы гавайскай. А вось «традыцыйныя» для краіны наркотыкі — раслінныя, якія атрымліваюць з маку і канопляў. Мефедрон і альфа-PVP — асабліва небяспечныя псіхатропныя рэчывы, з якімі спецыялісты таксама сустракаюцца падчас правядзення судовых экспертыз. Даволі часты «госць» і метадон — рэчыва, якое выкарыстоўваецца ў медыцыне. Пра асаблівасці выяўлення, ужывання і небяспекі наркотыкаў расказалі спецыялісты Дзяржкамітэта судовых экспертыз па Мінскай вобласці.**



### Забруджанасць макавага зерня і «майстры канапляводства»

Бяскрыўдная макавая кветка можа стаць небяспечным наркотыкам, калі за справу бяруцца ўмельцы. Сорт маку, які дадаюць у булкі, і таго, з якога вараць макавую саломку, можа быць адзін і той жа, уся розніца ў забруджанасці насення, растлумачыў **Аляксандр ХАРЫТОНІК, намеснік начальніка ўпраўлення спецыяльных экспертыз упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Мінскай вобласці:**

— Калі насенне недастаткова ачышчанае, на зерне трапляюць пыл і часцінкі макавай саломкі. А калі мак рос на паўднёвых схілах Афганістана, то ўтрыманне алкалоідаў у такіх часцінках вельмі высокае. І з паўкіло такога забруджанага зерня можна атрымаць дозу экстракцыйнага опіуму. У Беларусі практыкуецца падыход да нулявога забруджвання насення — праз граніцу прапускаецца толькі ідэальна чыстае зерне, якое наркатычнай небяспекі не нясе. Аднак можна правесці забруджванне опіумам насення спецыяльна, і з такіх зярнят наркаманы таксама вараць сабе «кайф».

А каноплі, якім цяпер таксама аб'яўлена вайна, у савецкія часы лічыліся каштоўным тэхнічным прадуктам, і найлепшыя спецыялісты ў гэтай галіне атрымлівалі значкі «Майстру канапляводства». Са сцяблін расліны рабілі вяроўкі, а з насення — алей ды падкормку для вадаплаўных. Аднак вырошчваць яе на падворку нельга, таксама як і прыродныя псілацыбінавыя грыбы, якія маюць галюцынагенны эфект. Аднак ёсць умельцы, што вырошчваюць «чароўныя грыбочкі» і ў памяшканні. Прычым, гэта высокаадукаваныя асобы, бо для росту такой грыбніцы патрэбныя аўтаматычныя кантролеры вільгаці, святла і тэмпературы. Часцей сустракаюцца і «лабараторыі» па вырошчванні канопляў на гідрапоніцы (без глебы).

— А ёсць яшчэ кактусы-пеёты, у якіх утрымліваецца мескалін — псіхатропнае амфітамінападобнае рэчыва. Першапачаткова такія кактусы сушылі індзейцы і выкарыстоўвалі ў сваіх абрадах, каб уваходзіць у транс, — дадаў **Уладзімір СУХАДОЛЕЦ, галоўны эксперт упраўлення спецыяльных экспертыз упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Мінскай вобласці.** — Некаторыя прышчэпліваюць пеёты на звычайныя кактусы для больш хуткага росту.

**Не заўжды ўсё, што трапляе на судовую экспертызу, з'яўляецца наркотыкам. «Небяспечнымі рэчывамі» могуць аказацца мука, цукар, соль, крухмал. Гашыш, напрыклад, вельмі падобны на гематаген; какаін ці амфетамін — на муку. А мефедрон, альфа-PVP ці метадон (крышталізаваны наркотык) у залежнасці ад ступені здраблення можна пераблытаць з цукровай пудрай ці соллю для ванны. Тым больш што крышталі альфа-PVP часта падфарбоўваюць у ружовы, чырвоны, блакітны ці сіні колеры.**

### Сезонныя, медыцынскія, прэкурсоры...

Летам, калі растуць мак і каноплі, рэчываў з іх паступае на судовую экспертызу больш. Не ў сезон эксперты даследуюць, як правіла, марыхуану, якая засталася з лета, або імпартную, радзей бывае гашыш. А восенню і ўзімку пераважаюць сінтэтычныя наркасродкі, псіхатропныя гатовыя да ўжывання рэчывы, у прыватнасці, мефедрон і альфа-PVP.

— З пэўнай перыядычнасцю (некалькі разоў на год) з'яўляюцца хвалі наркасродкаў, якія не набываюць шырокага распаўсюджвання (гераін, какаін, экстазі, ЛСД, амфетаміны), — удакладніў Аляксандр Харытонік. — Раней метадон у чыстым выглядзе сустракаўся досыць рэдка. Наркаманы, купляючы дозу, дзялілі яе папалам: адну ўжывалі, а ў другую дадавалі рэчыва-напаўняльнік і перапрадавалі іншаму, які рабіў тое ж самае, пакуль нарэшце не заставаўся толькі напаўняльнік са слядамі метадону. Цяпер жа з пункту гледжання «хіміі» прыходзіць вельмі чысты метадон, у яго менш спадарожных прадуктаў і прэкурсораў. І калі былыя наркаманы ўжываюць дозу, зыходзячы з таго, што яна такая ж разбаўленая, якой была раней, то пакідаюць гэты свет ад перадазіроўкі. Тым больш там усё ж могуць быць пабочныя прадукты ад хімічных рэакцый падчас вытворчасці наркотыку. Так што казаць пра аптымальную для кайфу, але не смяротную дозу вельмі цяжка.

У рэспубліканскім пераліку прэкурсоры падзяляюцца на дзве катэгорыі. Першая: рэчывы, якія выкарыстоўваюць у працэсе вырабу наркасродкаў. Гэта могуць быць ацэтон, воцатная кіслата, чырвоны фосфар, талуол — тое, што многімі выкарыстоўваецца ў штодзённым жыцці. Праўда, каб лічыцца прэкурсорам, яны павінны быць даволі канцэнтраванымі (фактычна, рэактывамі): воцатная кіслата, напрыклад, — мець 80 % і больш. Другая: рэчывы, з якіх атрымліваюць псіхатропы. Яны, як правіла, не сустракаюцца ў быце, а з'яўляюцца падрыхтаванымі да сінтэзу рэчывамі, растлумачыў спецыяліст.

— Наркотыкі, якія ўжываюцца ў медыцыне, таксама сустракаюцца не толькі ў бальніцах, але і ў быце. Напрыклад, прэпараты клоназепам ці трамадол, якія ўжываюць наркаманы, што стаяць на ўліку і атрымліваюць рэцэпт на іх атрыманне. Існуе і метадоназамяшчальная тэрапія, калі чалавека, які ўжываў цяжкія наркотыкі, стараюцца пазбавіць фізічнай залежнасці.

### Парашкі, мікранаслаенні, хімічныя формулы

Лабараторыя судовых экспертыз, дзе за год праводзіцца больш чым 1000 даследаванняў наркасродкаў, падчас якіх вывучаецца звыш чатырох тысяч аб'ектаў, падзелена на дзве зоны. У першай адбываецца агляд аб'ектаў, узяцце прадстаўнічай пробы і пробападрыхтоўка. Судовы эксперт аглядае аб'екты, фатаграфуе іх, распакоўвае спецыяльны пакет, звярае яго змесціва з дакументамі і зноў робіць здымкі. Пасля праводзіць візуальны агляд і вызначае, якая будзе пробападрыхтоўка рэчыва.

— Каб атрымаць аналітычную пробу, трэба зрабіць арганічны раствор наркатычнага сродку. Калі гэта рэчывы расліннай прыроды, напрыклад, макавая саломка ці марыхуана, з іх трэба выцягнуць актыўныя рэчывы (алкалоіды), таму праводзіцца экстракцыя. Калі гэта парашок — яго раствараюць. У залежнасці ад віду наркотыку да яго трэба падабраць адпаведнае асяроддзе: кіслае або шчолачнае. Наша аналітычнае абсталяванне не можа працаваць з воднымі растворамі, таму выкарыстоўваецца арганічны растваральнік, на які рэагуе наркотык, — расказаў намеснік начальніка ўпраўлення.

Усе рэчывы судовыя эксперты абавязкова ўзважваюць, вядома, калі гэта магчыма. Даследаваць можна не толькі наркатычныя сродкі, але і мікранаслаенні на аб'ектах, з якімі яны кантактавалі: вагі для ўзважвання наркотыку, трубкі, праз якія яго курылі, і нават пазногці чалавека, які фасаваў рэчыва.

У другой зоне лабараторыі робяць аналіз атрыманай пробы. «Разумнае» абсталяванне — храмата-мас-спектрометр — працуе бесперапынна і пастаянна. Каштуе яно больш за 100 тысяч долараў і спыняецца толькі на некалькі гадзін у год для тэхнічнага абслугоўвання дзяржаўнай паверкі. Гэтую працэдуру, дарэчы, праходзіць абсалютна ўсё абсталяванне лабараторыі: вагі, тэрмометры, цэнтрыфугі, шафы-сушылкі, піпеткі, падкрэслівае Аляксандр Харытонік:

— Працуе апарат па пэўным алгарытме. Доследная проба ўводзіцца ў апарат і праходзіць частку вузлоў. Падчас працэсу іанізацыі рэчыва падзяляецца на кавалкі, і калі пэўны набор гэтых кавалкаў трапляе на мас-дэтэктар, камп'ютар «бачыць», якія менавіта кавалкі сюды дайшлі.



Ён піша храматаграму, кожны пікавы паказчык якой азначае пэўнае рэчыва. У выніку апарат ідэнтыфікуе рэчыва, называючы яго хімічную формулу. Ужо па ёй эксперт вызначае, што за наркотык быў у даследаваным растворы.

Спыняць спектрометр, акрамя як для тэхабслугоўвання, не варта, патлумачыў судовы эксперт. Унутры апарата тэмпература 250—295 градусаў. А яшчэ ён пастаянна прадзімаецца геліем. Калі апарат выключыць, то на ўвод яго ў рабочы рэжым спатрэбяцца суткі. Акрамя таго, ён вельмі дарагі ва ўжыванні.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Надвор'е

# МЫ ДАЧАКАЛІСЯ ДАЖДЖУ, АЛЕ МАГЧЫМЫ МОКРЫ СНЕГ

## Новы тыдзень не прынясе цяпла...

**Падобна на тое, красавік забыўся, што ён другі вясновы месяц. З першых дзён нас ладна падмарозіла і заснежыла, тым самым ліквідаваўся дэфіцыт ападкаў у сакавіку.**

Толькі за мінулыя выхадныя на большай частцы тэрыторыі краіны прайшлі ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу колькасцю ад 1 да 15 міліметраў, а месцамі па Гродзенскай, Гомельскай і ў многіх раёнах Брэсцкай абласцей іх колькасць дасягнула 16—21 міліметраў. Там, дзе пераважалі ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу, паспела сфарміравацца снежнае покрыва. Па апошніх даных, максімальная вышыня снегу адзначаецца па паўднёвым захадзе Беларусі і складае 6—13 сантыметраў, месцамі вышыня гурбаў дасягае 15—17 сантыметраў. Аднак у найбліжэйшыя дні за кошт плюсавых дзённых тэмператур снег цалкам растане, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Пры гэтым характар надвор'я на працягу тыдня будзе няўстойлівым. Дастаткова холадна і ветрана для красавіка будзе ў аўторак. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. У многіх раёнах краіны адбудзецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра будзе ад плюс 2 да 8 градусаў цяпла.

У сераду на большай частцы краіны прагназуецца кароткачасовы дождж, уначы — дождж з мокрым снегам. У асобных раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с, ноччу і раніцай на дарогах будзе галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 4 — плюс 2 градусы, удзень — ад 4 да 11 цяпла.

Плюсавая тэмпература на працягу сутак чакаецца ў чацвер. Таму 7 красавіка на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, толькі ноччу па поўначы з мокрым снегам. Удзень у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература начнога паветра складзе ад плюс 1 да плюс 8 градусаў. Удзень яно прагрэецца ад плюс 12 градусаў па паўночным захадзе і да 20 цяпла па паўднёвым усходзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу пройдуць дажджы, па паўночным захадзе магчымы мокры снег. Месцамі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы будзе ад плюс 1 градуса да плюс 8, удзень — ад 5 да 11 цяпла, па паўднёвым усходзе да плюс 13 градусаў.

А ў суботу начныя замаразкі вернуцца на тэрыторыю нашай краіны. У гэтыя суткі ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы рэгіёна пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Ноччу і раніцай на асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. Удзень тэмпература складзе 5—12 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Русаму Міхаілу Іванавічу, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Уцюпіну Паўлу Уладзіміравічу, Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Казахстан, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

## Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

(www.belincasgroup.by)

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2022 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2021 год | 2020 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5.1. | 4 562 | 3 916 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 5.2. | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 5.3. | 22 791 | 19 387 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5.4. | 36 452 | 37 539 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 5.5. | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5.6. | - | - |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 5.7. | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5.8. | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 5.9. | 73 039 | 70 643 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 5.10. | 543 | 715 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 5.11. | 30 | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 5.12. | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 5.13. | 15 539 | 14 830 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 152 956 | 147 030 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 5.14. | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 5.15. | - | - |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 5.16. | 5 954 | 9 798 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 5.17. | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 5.18. | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | 5.19. | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 5.20. | 6 855 | 7 108 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 12 809 | 16 906 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 5.21. | 121 002 | 121 002 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | 5.21. | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 5.21. | 7801 | 243 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 5.21. | - | - |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 5.21. | 11 344 | 8 879 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 140 147 | 130 124 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 152 956 | 147 030 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2021 год

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2021 год | 2020 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 7.1. | 5 922 | 3 961 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 7.1. | - | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7.1. | 5 922 | 3 961 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 7.2. | 55 721 | 50 184 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 7.2. | 92 | 154 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 7.2. | 55 629 | 50 030 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 7.3. | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 7.4. | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 7.5. | (51) | - |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 7.6. | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 7.7. | (96) | 859 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 7.8. | 64 109 | 55 846 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 7.9. | 110 395 | 94 466 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 7.10. | 1 | 3 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 15 309 | 14 509 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 7.11. | 5 286 | 4 947 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 5.21. | 10 023 | 9 562 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
**Лізавета:** Які выкуп, якое «красці»? Вы пра што ўвогуле? Так ужо сто гадоў ніхто не робіць, і я б дакладна не хацела ўсіх гэтых дзіўных традыцый у сябе на цырымоніі. І муж мой таго ж прытрымліваецца, для нас усё гэта вельмі дзіўна выглядае. Я за сваё жыццё ў сясцёр шмат разоў на вяселлях пабывала, і кожны раз, калі было нешта накшталт выкупу, адчувала іспанскі сорам.

**Сяргей:** Тады ў цябе на тваім вяселлі і бойкі не будзе. Ну ды добра.

### Багатыя сваякі

**Сяргей:** Ліза, дзетка, ты калі вяселле арганізоўвала, якую перад сабой задачу ставіла? Запомніць гэты цудоўны дзень на ўсё жыццё і заадно трошкі грошай назапасіць або залаты пыл у вочы сваякам пусціць? Я проста ўспомніў: адна мая калега вяселле рабіла, дык яны з выручаных грошай збіраліся ў замежнае турнэ паехаць. А ў выніку плазму на паўсцяны ў інтэрнат набылі, мабыць, вельмі тэлевізар паглядзець захацелася.

**Лізавета:** Ну, па-першае, вядома, проста хацела ўвасобіць у жыццё нейкую дзіцячую мару аб белай сукенцы ці што. А па-другое, зразумелая справа — набыць нейкі стартавы капітал, мы з мужам адразу будзем асобна ад бацькоў жыць, таму патрэбны ўсякія бытавыя прадметы, без якіх не абысціся: пральная машына, халадзільнік, пыласос і г. д.

**Сяргей:** На якую незгаральную суму ты спадзяешся? Ну, на тую, якую абавязкова атрымаеш?

**Лізавета:** Пакуль што дакладна ведаю, што мае бацькі падораць столькі ж, колькі я патрачу, так што ў нуль дакладна выйду. Ну, дзесьці 2000 долараў, спадзяюся, усё ж такі падораць, але я нават неяк стараюся пра гэта не задумвацца, каб, калі раптам нейкія надзеі не апраўдаюцца, не хвалявацца.

**Сяргей КУРКАЧ,
Лізавета ТАНАНА.**

---

Незвычайнае побач

# ШАКАЛАДНЫ РАЙ

## Карэспандэнт «Звязды» наведала выстаўку, дзе ўпершыню патрымала ў руках сапраўдны какава-плод

**9 з 10 чалавек кажуць, што любяць шакалад. Але што мы ведаем пра любімы ласунак? Які шакалад карысны? Як яго выбіраць і правільна ўжываць? Гэтымі і іншымі шакаладнымі сакрэтамі дзеляцца на незвычайнай выстаўцы «Музей шакаладу «Шакаландыя». Яна аб'ездзіла ўжо больш чым 70 гарадоў свету і цяпер упершыню завітала ў Мінск. Таму, калі вы не ведаеце, куды схадзіць з дзецьмі, шчыра рэкамендую перанесціся ў свет шакаладу.**



### 25-КІЛАГРАМОВАЯ ЭЙФЕЛЕВА ВЕЖА, РАЯЛЬ І САЛА

Ну які музей без экспанатаў? Чаго тут толькі няма: шакаладныя шашкі, гантэлі, футбольны мяч і бутсы, шакаладнае сала і шакаладная бульба, шакаладная Эйфелева вежа, шакаладныя панды, пінгвіны і фламінга.

— Для вырабу экспанатаў выкарыстоўваем самы звычайны цёмны, белы і малочны шакалад, а таксама цукровую і марцыпанавыя пасты, кандытарскія ўпрыгожванні, харчовыя фарбавальнікі, — распавядае наш экскурсавод Алена. — Усе шакаладныя шэдэўры пакрываюцца харчовым лакам, каб надаць больш яркі выгляд, а таксама працягнуць тэрмін службы.

— І ўсю гэтую прыгажосць сапраўды можна з'есці? — пытаецца хтосьці з групы.

— Можна. Але ўсё ж не варта. Адно з галоўных правілаў для наведвальнікаў нашага музея — не грызці, не ламаць, не псаваць экспанаты. Нашы майстры ўклалі вельмі шмат любові і творчасці ў кожны, і мы хочам, каб як мага больш людзей бачылі гэтую прыгажосць у арыгінальным выглядзе.

— А што, былі выпадкі, калі пашкоджвалі шакаладныя шэдэўры? — цікаўлюся. Алена паказвае разламаны і пагрызены шакаладны банан. «Затое цяпер ёсць магчымасць прадэманстраваць цікаўным наведвальнікам, як выглядае экспанат знутры», — жартуе яна.

— О, здаецца, я знайшла сукенку сваёй мары, і туфлікі, і сумачку, — эмацыянальна ўсклікае адна з наведніц.

— Засталося ператварыцца ў Эльзу з «Халоднага сэрца», каб убор не растаў, — жартуе яе дачка і просіць маму сфатаграфаваць яе за шакаладным раялем.

Ёсць сярод экспанатаў і карціны з шакаладу. Калі трапіце ў музей, абавязкова папрасіце экскурсавода распавесці гісторыю пра знакамітую работу швейцарскага мастака Жана-Эцьена Ліятара «Шакаладніца». Копіі менавіта гэтай карціны на выстаўцы я не знайшла, але былі іншыя. «Раніца ў сасновым лесе» Шышкіна, «Сланечнікі» Ван Гога. Апошняя (не без дапамогі наведвальнікаў) не так даўно разваліласяна шакаладныя кавалачкі. У выніку карціна ператварылася ў своеасаблівую інсталяцыю, якая, як па мне, глядзіцца вельмі арыгінальна. Дарэчы, рамы для салодкіх палотнаў таксама зроблены з чыстага шакаладу. У якасці клею выкарыстоўваецца гарачы шакалад.

Усе экспанаты, прадстаўленыя на выстаўцы, — творы шакаладных спраў майстра — шакалацье.

— У шакалацье цудоўная смакавая памяць, востры нюх, багатая фантазія, мастацкі густ і фізічная вынослівасць. І галоўнае — тытанічнае цярпенне. Працаваць з шакаладам і не з'есці — задача не з лёгкіх. А можа, пасля наведвання выстаўкі хтосьці захоча стаць шакалацье? — звярнулася экскурсавод да дзяцей — у той дзень там было некалькі груп школьнікаў. Урок пра шакалад — у маім дзяцінстве пра такое можна было толькі марыць.

— Бачыце — дзве гіры. Здагадайцеся, якая з іх шакаладная, а якая сапраўдная, — азадачвае наш экскурсавод. — А хто зможа вызначыць, які з васьмі какава-пладоў (з іх здабываюць какава-бабы — галоўны інгрэдыент для вытворчасці якаснага шакаладу) сапраўдны. На выгляд гэта зрабіць вельмі складана. А вось калі ўзяць у рукі, усё адразу становіцца зразумелым. Шакаладныя копіі істотна адрозніваюцца па вазе. Падумалася, што з какава-плода атрымаўся б цудоўны музычны інструмент — шэйкер. Шкада, што яго нельга купіць на выстаўцы. Дарэчы, ці ведалі вы, што племя мая выкарыстоўвала какава-зерне ў якасці грошай? У прыватнасці, за 10 бабоў можна было купіць аднаго труса.

Асабіста мне вельмі спадабаўся кароценькі фільм пра гісторыю шакаладу. Цікава было паглядзець на трапічны лес, дзе растуць какава-дрэвы. На тое, як людзі (шакавала, што пераважная большасць работнікаў какава-фермаў атрымлівае ад 10 да 20 долараў у месяц) збіраюць з іх плады, з якіх тут жа, на месцы, вымаюць какава-бабы. Як ферментуюць апошнія ў драўляных бочках, а потым сушаць на адкрытым паветры. Дарэчы, для вырабу аднаго кілаграма сапраўднага шакаладу неабходна каля 900 какава-зерняў.

### САКРЭТЫ ДЭГУСТАЦЫІ І ШОКА-РАСФАРБОЎКА

Акрамя экспанатаў, на выстаўцы хапае шакаладных актыўнасцяў. У прыватнасці, у «Доме мод» стаіць скрыня з рознымі капялюшыкамі і аксесуарамі, і дзеткі могуць стварыць ідэальны вобраз для шакаладных сабачак. Можна загадаць жаданне каля чароўнага шакаладнага дрэва і пагуляць з сябрамі ў «салодкія» настолкі. Гульня «Шакаладная душа» дапаможа праверыць, ці добра вы знаёмы са светам шакаладу і ці ўважліва слухалі экскурсавода.

Самая ж любімая частка выстаўкі ва ўсіх ласуноў — дэгустацыя бельгійскага шакаладу і салодкі майстар-клас. Што, пагадзіцеся, зусім не дзіўна.



Напрыканцы экскурсіі Алена прапанавала нам пераўвасобіцца ў шакалацье. Мы надзелі яркія аранжавыя капялюшыкі, фартушкі і нарукаўнікі і селі за столікі. Праз некалькі хвілін перад кожным з нас стаяў паднос з васьмю гатункамі натуральнага бельгійскага шакаладу.

— Спачатку глядзім, дакранаемся, слухаем, нюхаем. І толькі пасля каштуем і запамінаем, — дзеліцца Алена сакрэтамі дэгустацыі. Дарэчы, вучоныя даказалі, што пах шакаладу ў крамах павялічвае продажы.

— Дарослыя ведаюць, што выбіраць, — усміхаецца Алена і звяртаецца да маленькіх ласуноў. — Памятайце: сапраўдны і карысны шакалад — толькі цёмны, а ўсё астатняе — для задавальнення. Дарэчы, раней горкі шакалад лічыўся лекамі, ён прадаваўся ў аптэках і толькі па рэцэпце ўрача. Таму цяпер вы ведаеце, што рабіць, калі забалела галава ці, напрыклад, пагоршыўся настрой. З'ешце кавалачак шакаладкі, і, глядзіш, усё наладзіцца.

**Калі? Да 17 красавіка.**

**Дзе? Гандлёвы цэнтр «Еўропа» у Мінску.**

Яшчэ да з'яўлення цвёрдага шакаладу з какава-бабоў рабілі какава-напой. Для яго прыгатавання зерне перамолвалі разам з кукурузнай мукой і перцам чылі. Не падсалоджвалі і пілі халодным. Нягледзячы на горыч, какава лічылі напоем багоў.

Парадай экскурсавода ўсе дзеткі паспяхова скарысталіся падчас майстар-класа. Як кажа мой трохгадовы сын, «для падстрахоўкі». Алена ж раздала кожнаму па невялікай шакаладнай 3D-фігурцы і прапанавала пакрыць коціка кандурынам.

— Чым-чым? — запыталіся мы.

Экскурсавод патлумачыла, што кандурын — гэта натуральны фарбавальнік. Усе кандытарскія вырабы, пафарбаваныя ім, цалкам бяспечныя і іх можна ўжываць не толькі дарослым, але і дзеткам.

Дзеці з'елі свае шакаладныя міні-карціны, не выходзячы з-за стала. Працягласць жа жыцця экспанатаў, створаных прафесійнымі шакалацье, можа дасягаць пяці гадоў. Галоўнае — выконваць тэмпературны і вільготнасны рэжым пры экспанаванні і транспарціроўцы.



— Аптымальная тэмпература навакольнага асяроддзя павінна быць на ўзроўні 20—24 градусаў Цэльсія. Галоўны вораг — сонца, прамы сонечны прамень можа растапіць экспанат нават у халоднае зімняе надвор'е. Пасля трох-чатырох гадоў насычанага «шакаладнага жыцця» адпраўляем экспанаты на заслужаны адпачынак. А пасля ствараем новую шакаладную калекцыю.

Для «Шакаландыі» выкарыстана больш за 500 кілаграмаў шакаладу. Таму я не здзівілася, калі пачула, што адзін з наведвальнікаў выстаўкі папрасіўся... застацца пераначаваць у музеі. Сказаў, што ўсё жыццё марыў прачнуцца ў шакаладным раі. Праўда гэта ці выдумка, вы даведаецеся, калі наведаеце выстаўку. А пакуль мы насалоджваемся шакаладным раем, арганізатары выстаўкі думаюць над стварэннем «Музея торта».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК,
фота аўтара.**



Нават сала з шакаладу.



Шакаладныя панды.

### Што такое якасны шакалад?

Першае і важнае правіла пры выбары шакаладу — уважліва чытайце этыкетку. У склад якаснага шакаладу ўваходзяць какава цёртае, какава-масла, а таксама, калі гэта малочны шакалад, цукар, сухое малако. Ніякіх іншых кампанентаў быць не павінна. Важны яшчэ і працэнт утрымання какавы ў шакаладзе. Чым больш, тым лепш. Пры фабрычнай вытворчасці якаснага шакаладу ў яго склад могуць уваходзіць натуральныя араматызатары, прыродныя эмульгатары (лецыцін).

Тэрмін прыдатнасці таксама падкажа, які шакалад выбраць. У натуральнага рамесніцкага прадукту ён складае не больш за шэсць месяцаў. А калі плітка з начынкай — не больш за чатыры месяцы. Пры фабрычнай вытворчасці шакаладу тэрмін прыдатнасці можа даходзіць да года.

### Колькі і як правільна есці шакалад?

Дзённая норма для дарослага чалавека — 30—50 грамаў горкага шакаладу (ад трэцяй часткі да паловы звычайнай пліткі). Малочнага і белага шакаладу пажадана есці ў два разы менш — не больш за 25 грамаў у дзень.

Дзецям да сямі гадоў рэкамендавана не больш за 20 грамаў горкага шакаладу ў тыдзень, іншымі словамі, тры-пяць грамаў у дзень. Да трох гадоў наогул не раяць даваць шакалад. А з малочным ласункам лепш знаёміць дзяцей у школьным узросце і таксама дазавана, бо ёсць рызыка з'яўлення алергічнай рэакцыі.

Што датычыцца часу сутак, калі лепш ласавацца шакаладам, то тут строгіх правіл няма. Можна есці раніцай, днём, вечарам, галоўнае — не з'ядаць вялікую колькасць за адзін раз. Раніцай найлепш засвойваюцца тлушчы і вугляводы, днём шакалад паляпшае выпрацоўку гемаглабіну. Для хворых на дыябет ёсць шакаладкі без утрымання цукру.

### Дзе знайсці добры шакалад?

Адзін з варыянтаў — набываць рамесніцкі шакалад. У гэтым выпадку вытворцы закупляюць какава-бабы з вызначаных плантацый, нерафінаваны трысняговы цукар і нерафінаванае какава-масла — усяго тры інгрэдыенты, з якіх атрымліваецца смачны і вельмі водарны шакалад. Таксама выдатны варыянт — гатаваць шакалад самастойна дома. Альбо набываць у надзейных фабрычных вытворцаў, якія строга сочаць за складам і якасцю прадукцыі.

# «СПЫТАЙСЯ Ў СВАЙГО ДЗЯДЗЬКІ, ЁН СКАЖА ТАБЕ ЎСЁ»

## Выпрабаванні «старога вераб'я»



Так склалася, што да гэтага гістарычнага персанажа адносіны ўтварыліся дваістыя.

Не ў апошнюю чаргу з-за вельмі эмацыянальнай ацэнкі Уладзіміра Караткевіча, які дакараў Адама Ягоравіча Багдановіча, бацьку паэта Максіма Багдановіча, што той не змог ацаніць талент сына, не пусціў яго вучыцца ў Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт да акадэміка Шахматава і нават не прыехаў да паміраючага ў Ялту...

Пры гэтым дзякуючы Адаму Багдановічу яго сын стаў менавіта беларускім паэтам, і ўласныя ягоныя работы па фальклоры і этнаграфіі беларусаў маюць каштоўнасць...

Міхась Стральцоў у эсэ «Загадка Багдановіча» пісаў: *«Не мы судзім за нешта Адама Ягоравіча, судзіць гісторыя, судзіць і шмат што даруе радзіма, бо яна бачыць: тут трагедыя, і трагедыя не аднаго толькі Адама Ягоравіча. Гэта трагедыя часу. Максім Багдановіч апярэджваў час, і ён перамог. Адам Ягоравіч можа перамагчы, і то толькі часткова, дзякуючы сыну».*

Давайце не будзем судзіць, а проста ўспомнім цікавыя факты з біяграфіі гэтага адметнага чалавека.

### ХЛОПЕЦ З ХАЛОПЕНІЧ

У лісце да свайго сябра Максіма Горкага Адам Багдановіч разважае: *«Вы пішаце, што вы ўлюбёныя ў Італію і італьянцаў, але мне здаецца, што гэта ўсё ў вас ідзе ад галавы, а не ад сэрца. Што такое Італія?.. А вось мае Халопенічы — гэта іншае, таму што там, што ні крок, то ўспаміны, якія кранаюць струны майго сэрца».*

Мінулым летам давялося наведаць Халопенічы, сённяшні гарадскі пасёлак, дзе 160 гадоў таму ўбачыў свет Адам Ягоравіч Багдановіч. Жывапісныя мясціны... Рэшткі Свята-Успенскай царквы, дзе, мяркуючы па пастаўленым унутры лаўкам, пад адкрытым небам адбываюцца богаслужэнні. Насупраць, амаль сцяна да сцяны, утульная драўляная новая цэрквачка. У цэнтры пасёлка, на плошчы, — бюст Адама Багдановіча, дзе ён пазначаны як «этнограф, педагог». Побач — помнік у гонар скасавання прыгону, на чорным граніце пастамента з крыжам напісана: «19 февр 1861 г. Холопеничская Волость».

*«Я крестьянин. Отец мой, Юрий Лукьянович, был крепостным, дворовым, повар по профессии... Дед мой, Лукьян Степанович, был также дворовый — садовнік... Мой прадед Степан, по-видимому, первый стал носить фамилию Богдановича, по фамилии своего отчима Никифора Богдановича, как вошедший в состав его «двора» податной единицей. По отцу он должен бы писаться Скоклич»* — так пачынаў свае мемуары Адам Ягоравіч.

Шлях вясковага хлапчука, нашчадка прыгонных, у адукаваны свет быў не з лёгкіх... Хоць пра родныя Халопенічы адгукаўся Адам Ягоравіч з пяшчотай, але ўспаміны пра цёмнае, прынізлівае мінулае наўрад ці любіў. Са скуры прогся, каб выбрацца ў свет да навукі. Хрышчаны быў па ўніяцкім абрадзе і атрымаў імя Адольф, а паступаючы ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, змяніў яго на Адам, больш праваслаўнае. Так што мог жыць на свеце не Адам Багдановіч, а Адольф Скокліч.

Пушкін, Лермантаў, Леў Талстой, Дастаеўскі, народнікі... Руская культура ўспрымалася сімвалам лепшага, вольнага і духоўнага, жыцця. Усё жыццё Адам Ягоравіч імкнуўся стаць сваім у свеце рускай інтэлігенцыі. І хоць нават пасябраваў з Горкім, адносіны, хутчэй за ўсё, сустракаў паблажлівыя. Ці мала такіх самавукаў, самародкаў... Манаграфія пра міфалогію беларусаў, у якой шмат было ад спадчыны ўлюбёнай бабкі Рузаліі, не атрымала таго розгаласу, на які спадзяваўся...

Паблажлівы да беларускай народнай культуры тон — таксама ад таго комплексу нуварыша: я ж прыўзняўся над гэтым, я бачу недасканаласць...

Ды Адам Ягоравіч нават назву родных Халопеніч спрабаваў вытлумачыць «высока» — маўляў, ад скіфскай мовы, ад «хола» ці «гола» — «вада, возера», і «пея» — рака. Ну, на горшы выпадак, ад балцкага гідроніма «халапея» — возера, утворанае рэчкай... Толькі не ад «халопы».

І ў гэтым Адам Ягоравіч — тыповы беларус. Колькі іх і ў наш час, пераязджаючы ў гарады, выракалася роднай мовы, саромелася акцэнту і вясковага паходжання... Міхась Стральцоў заўважыў у эсэ «Загадка Багдановіча» пра мову твораў Адама Ягоравіча: *«Што ж, дарэчы, датычыць яго рускай мовы, дык яна, шчыра кажучы, не вызначаецца якімі-небудзь асаблівымі вартасцямі, а наадварот, адчуваецца ў ёй тыя залішнія правільнасць, закругленасць і грунтоўнасць, якія адразу выдаюць пераважна кніжнае веданне мовы».*

Таму такой антытэзай успрымаецца сын Адама Ягоравіча Максім. Які з дзяцінства быў у асяродку «высокай», сусветнай, рускай, культуры, але пацягнуўся да сваёй роднай — і мэтай жыцця паставіў давесці, што яна не горшая, не бяднейшая за любыя іншыя. І давёў.

### МУЖ АРЫСТАКРАТАК

Чалавек, які сам сябе зрабіў, зведаў страшэнныя цяжкасці на шляху да ведаў... Рамантычны арэол дадаваў харызмы. Адама Багдановіча кахалі самыя рамантычныя і наогул цудоўныя жанчыны.

Першай была Марылька... Марыя Апанасаўна Мякота, прадстаўніца старажытнага арыстакратычнага роду, праўда, настолькі збяднелага, што дзеці гадаваліся ў прытулку.

Марыя была зусім юнай, калі яе сэрца скарыў старэйшы на сем гадоў настаўнік Адам Багдановіч: не паспела нават скончыць навучанне ў Пецярбургскай жаночай настаўніцкай школе. Яе маці Адама Ягоравіча ненавідзела.

Зяць ахарактарызуе характар цешчы як «болезненно неуравновешенный и чрезвычайно эксцентричный». У чым, безумоўна, прадузятасць.

Дарэчы, сябры ўспаміналі, што і з Марыяй не так ладна жылі, нават гразілася з'ехаць...

З аднаго боку, Адам Ягоравіч ставіўся да юнай жонкі паблажліва: «Необходимо отметить еще одну черту: чрезвычайную, иногда мучительную живость воображения», «она вдобавок обладала грацией котенка», «повышенная чувствительность в обыденной жизни с ее мелочными происшествиями иногда проявлялась вспыльчивостью»... С другога, ён аніяк гэтую «живость» не абмяжоўваў. Марыя Мякота займалася з дзецьмі па асаблівай праграме, ладзіла з імі імпрэзы... «Часто у нас собиралась молодежь, особенно в Минске. Пение, декламация, чтение, беседы, споры...»

Марылька шмат курыла, рабіла літаратурныя спробы.

І раптам — катастрофа. Хуткацечныя сухоты.

Дарэчы, хваробу знайшлі толькі праз месяц пасля апошніх, няўдалых, родаў (дачка Ніна памерла). А Марыя «из непреодолимого чувства женской стыдливости не позволяла себя выслушать ни одному врачу».



Пасля смерці Марылькі — сюжэт для «мыльнай оперы». У Ніжнім Ноўгарадзе, куды Адам Ягоравіч паехаў на работу, у харызматычнага ўдаўца закахалася маладзенькая сястра жонкі яго сябра Максіма Горкага Аляксандра Волгіна. Прыгажуня, разумніца, арыстакратка. Пашлюбаваліся.

І таксама памерла рана, ад родаў.

А потым нявенчанай жонкай стала малодшая сястра Марыі Мякоты Аляксандра — прыехала даглядаць пляменнікаў. Усё жыццё з-за ганьбы хавалася ад людзей... Але не кідала нашмат старэйшага за сябе Адама Багдановіча. Нарадзіла яму пяцярых дзяцей.

### ПРАГРЭСІЎНЫ І НЯЎВАЖЛІВЫ БАЦЬКА

Па водгуках сяброў, тры браты Багдановічы жылі як беспрытульнікі. Іншымі словамі, ніхто не прымушаў іх у час паесці, класціся спаць, не блытацца па вуліцы...

Дый толькі дабрыня другой жонкі, Аляксандры Волгінай, якая настаяла, што пасынкі павінны жыць у іх сям'і, выратавала хлопчыкаў ад туляння па радзіне — Адам Ягоравіч быў схільны да такога.



Можна абурацца... Але, з іншага боку, сам Адам Ягоравіч меў настолькі цяжкое дзяцінства, што наўрад ці мог надаваць значэнне нейкім бытавам рэчам. Ён даваў сваім дзецям галоўнае, на ягоны погляд, — волю і шлях да ведаў. Можа, не заўсёды на стале былі прысмакі, але дзеці былі адзетыя, кавалак хлеба маглі знайсці — тое, што не заўсёды меў іх бацька. Утульнасці не хапала — але для кожнага быў асобны светлы пакой, хоць «абстаноўка самая скупая». Тое, што ўсе тры сыны Марыі Мякоты і Адама Багдановіча раслі вундэркіндамі, геніямі, сведчыць, што была ў бацькавым падыходзе слушнасць.

З аднаго боку, шкада чытаць ва ўспамінах стрыечнай сястры Ганны Валасовіч-Грaзновай, як Максім, каб пазбягаць стасункаў з нялюбай мачахай-цёткай, «ніколі не бываў разам з усімі, не палуднаваў, не піў гарбаты. Заўсёды праходзіў у свой пакой». З другога боку, яму тое дазвалялася — выказваць відавочную непавагу. Старэйшы брат Вадзім, сябар Якава Свярдлова, яшчэ ў гімназіі займаўся рэвалюцыйнымі справамі — бацька не забараняў. Узяўся Максім за беларускую культуру — яго справа, чытае, як і брат, Прудона і Бакуніна — няхай... Максім так згадваў пра бацькаву бібліятэку: *«В ней есть все существенное, что появилось когда бы то ни было в литературе всего мира. Мы с детства проходили эту мировую школу. Отец начинал, с чего начинает каждый народ в своем творчестве, с эпоса. Мы уже в детстве знали «Рустама и Зораба», «Илиаду», «Калевалу», былины и пр. и пр...»*

### НЯЗДЗЕЙСНЕНЫ ВУЧОНЫ

«Стары верабей» — называў Максім бацьку, а сябе — «маладым вераб'ём». Не прыехаў «стары верабей» да паміраючага сына ў Ялту, хоць той пісаў — «маладому вераб'ю блага». Апраўдваўся — не ведаў, што настолькі блага.

Міхась Стральцоў звярнуў увагу на пачатак успамінаў Адама Ягоравіча пра сына, якія яму заказалі напісаць з савецкай Беларусі: «Якая неадпаведнасць у тым, што не ён пра мяне, а я пра яго павінен пісаць успаміны».

Стральцоў бачыў тут рэўнасць і здзіўленне: вось, сын дамогся таго, чаго яму не ўдалося... Прызналі класікам. Прычым на той ніве, якую Адам Ягоравіч лічыў неўрадлівай. Ён лічыў сябе знаўцам літаратуры, таму нядзіўна, што не мог змірыцца — прагледзеў побач выдатнага паэта... Ганна Валасовіч-Гразнова піша: *«Адам Ягоравіч ведаў сабе цану. Часта казаў: «Спытайся ў свайго дзядзькі (г. зн. яго), ён скажа табе ўсё»; «у бібліятэку табе не варта хадзіць, усё, што табе трэба, ты знойдзеш у свайго дзядзькі».*

Але сведкі ўспамінаюць, і як ласкава называў сына «беларускі Гамер»...

Адам Ягоравіч Багдановіч быў чалавекам складаным і безумоўна таленавітым. *«По призванию я был всегда учителем: всю жизнь учил, не закрывая рта, в школе, в лесу, в поле, в чайной, в вагоне, на пароходе, в крестьянской избе, в салоне, — словом всюду, где представлялся случай и были слушатели, кто бы они ни были. Иногда это бывало глупо (явно — не в коня корм), но я не смущался и никогда не каялся: в большинстве случаев успех был несомненный».*

Ніхто не ведае дакладна, чым застанецца ў гісторыі.

Андэрсен паблажліва ставіўся да сваіх казак, лічачы, што для вечнасці напісаў маралізатарскія раманы...

Даніэль Дэфо, аўтар шматтомных трактатаў, стварыў «Рабінзона Круза» за кароткі тэрмін, бо патрэбна было выдаваць замуж дачку.

Адама Багдановіча, які спадзяваўся на славу навукоўца, ведаюць як бацьку паэта Максіма Багдановіча.

Меншая колькасць ведае яго як аўтара манаграфіі «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов».

Толькі спецыялісты памятаюць пра ягоную грунтоўную працу «Язык земли. Опыт образования и значение водо-речных и озерных имен и от них происходящих». Больш за тысячу старонак рукапіснага тэксту, так і не выдадзенага. Хоць работа, прысвечаная Максіму Горкаму, была прынятая да выдання Дзяржаўнай акадэміяй гісторыі матэрыяльнай культуры — не без дапамогі таго ж Горкага. Але ў 1937-м нават Максім Багдановіч пачаў лічыцца цемрашалам. «Язык земли» прызналі контррэвалюцыйнай працай. А была яшчэ манаграфія «Этнический состав народов славянских и русских» у 2-х тамах...

Адам Багдановіч так і не наведаў магілы Марыі Мякоты... У Халопенічы прыязджаў некалькі разоў, апошні ў 1928 годзе. Незадоўга да смерці пісаў сястры: *«Есть у меня еще одно задушевное желание — это съездить в Минск и в Холопеничи: тянет туда. Но это трудно осуществить. Во-первых — две поездки были бы тяжелы для нашего бюджета; а во-вторых, для меня это было бы делом рискованным: поездка в Холопеничи меня бы так взволновала, что я, вероятно, и сложил бы там свои старые кости под березами моих предков».*

Памёр Адам Багдановіч у 1940 годзе ў Яраслаўлі. Толькі два сыны ад трэцяга шлюбу перажылі яго.

У завяшчанні Адама Ягоравіча, у пункце «Кнігі асаблівага значэння», першым выданнем значацца «Творы» на беларускай і рускай мовах Максіма Багдановіча.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# Беларускія біятланісты — пераможцы чэмпіянату Расіі

## У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем важныя навіны



**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** Беларускія біятланісты выступілі на чэмпіянаце Расіі, турнір праходзіў у Цюмені. Беларусы Ілья Аўсеенка, Дзмітрый Лазоўскі, Іван Тулацін і Мікіта Лабастаў занялі другое месца ў мужчынскай эстафетнай гонцы 4х7,5 км. Яны ўступілі 6,1 секунды пераможцам — камандзе Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі, вынік якой 1 гадзіна 18 хв. 07,9 сек. На трэцім месцы — біятланісты Цэнтральнай федэральнай акругі.

А Ірына Лешчанка, Ганна Сола, Дзмітрый Лазоўскі і Мікіта Лабастаў сталі пераможцамі ў змешанай эстафеце. Другое месца ў прадстаўнікоў Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі, трэцяе — у зборнай Масквы.

Пакуль беларускія біятланісты выступалі ў Цюмені, выканкам Міжнароднага саюза біятланістаў аднагалосна прыняў рашэнне аб прыпыненні дзейнасці федэрацый Беларусі і Расіі. Беларуская федэрацыя біятлона апублікавала афіцыйную заяву адносна гэтага рашэння IBU. «Мы катэгарычна не згодныя з рашэннем выканкама Міжнароднага саюза біятланістаў па прыпыненні нашага членства ў саюзе і адхіленні спартсменаў ад удзелу ў міжнародных спаборніцтвах, якія праводзяцца пад эгідай IBU. У сувязі з гэтым да ведама кіраўніцтва IBU даведзена наша пазіцыя аб неабгрунтаванасці прынятых рашэнняў і аргументы на карысць іх найхутчэйшай адмены. Аб'ектыўна ацэньваючы бягучую сітуацыю, абвінавачанні і абмежаванні ў дачыненні да беларускага біятлона, мы разам з Саюзам біятланістаў Расіі працягваем актыўна працаваць над аднаўленнем правоў федэрацыі і нашых спартсменаў з прымяненнем шырокага арсенала юрыдычных сродкаў і іншых магчымасцяў. У нас ёсць дастаткова часу да пачатку спаборніцкага сезона і чарговага Кангрэса IBU, які пройдзе ў верасні 2022 года, каб дэталёва разабрацца ў сітуацыі і прыняць меры па аднаўленні справядлівасці», — сказана ў заяве.

**ЦЫТАТА ТЫДНЯ.** «Беларускія і расійскія спартсмены не на словах, а на справе даказалі сваё адзінства. Беларускія спартсмены падвергліся беспрэцэдэнтнаму ціску ў перыяд падрыхтоўкі да такійскай Алімпіяды і Гульняў у Пекіне. Мы стойка вытрымалі, спартсмены горда неслі сцяг нашай краіны. Упэўнены, так будзе і ў далейшым», — сказаў міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук падчас форуму «Мы разам. Спорт», які прайшоў у Маскве. Ён адзначыў, што Расія здольная праводзіць спартыўныя мерапрыемствы любога ўзроўню. «Мы гатовыя прымаць спартсменаў з Расіі на любых спаборніцтвах і вучэбна-трэніровачных зборах. Мы гатовыя сумесна праводзіць мерапрыемствы, універсіяды. Мы гатовыя пашырыць удзел нашых універсітэтаў у гэтых спаборніцтвах. Раней быў адзін — цяпер будзе восем, мы прынялі рашэнне», — дадаў міністр.

**КАМАНДА ТЫДНЯ.** Беларускія футбалісты перамаглі каманду Бахрэйна ў другім кантрольным матчы новага сезона. Вынік матча — 1:0. Пераможны гол забіў Андрэй Салавей. У першым матчы новага сезона беларускія футбалісты разграмілі каманду Індыі з лікам 3:0. У другім тайме гэтай сустрэчы мячы забілі Арцём Быкаў, Андрэй Салавей і Валерый Грамыка.

А футбалісты маладзёжнай зборнай Беларусі (U-21) дабіліся перамогі ў гасцявым спарынгу з аднагодкамі з Азербайджана — 3:1.

**ПАЗІЦЫЯ ТЫДНЯ.** Беларуская тэнісістка Арына Сабаленка засталася на пятай пазіцыі ў абноўленым рэйтынгу Жаночай тэніснай асацыяцыі (WTA). У яе актыве 4657 балаў. На турніры катэгорыі WTA-1000 у амерыканскім Маямі найлепшая беларуская тэнісістка выбыла з барацьбы пасля паражэння ў сваім стартавым паядынку, але захавала за сабой 5-е месца ў сусветным рэйтынгу. Пераможцай гэтага турніру стала польская спартсменка Іга Свёнтэк. Яна ўпершыню ў кар'еры ўзначаліла сусветны рэйтынг.

**АБ'ЯВА ТЫДНЯ.** Федэрацыя спартыўнай барацьбы Расіі аб'явіла аб стварэнні прафесійнай барцоўскай лігі Poddubny Wrestling League. Першы турнір адбудзецца ў Маскве ў маі, у ім возьмуць удзел найлепшыя барцы Расіі і Беларусі, а таксама прадстаўнікі іншых краін. Спаборніцтвы пройдуць па алімпійскіх стылях спартыўнай барацьбы (вольная, грэка-рымская, жаночая), а таксама ў грэплінгу і панкратыёне. У кожнай вагавой катэгорыі выступяць па 16 спартсменаў. Барацьба будзе весціся ў фармаце асабістага турніру з падвядзеннем вынікаў агульнакаманднага першынства.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** Беларускі нападаючы «Нью-Джэрсі» Ягор Шаранговіч закінуў тры шайбы ў матчы рэгулярнага чэмпіянату НХЛ супраць «Фларыды». Першую шайбу ён закінуў у першым перыядзе, адкрыўшы лік матча. Дзве астатнія шайбы ў вароты саперніка беларус закінуў у другім перыядзе. Гэты хет-трык стаў для беларуса першым у кар'еры ў НХЛ.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

## Даты Падзеі Людзі

### 5 КРАСАВІКА

**У краіне**

**1619** год — надрукавана «Граматыка» Мялеція Смятрыцкага («Грамматики словенския правильное синтагма...»), якую Міхаіл Ламаносаў разам з «Арыфметыкай» Л. Магніцкага і «Псалтыром рыфматворным» Сімяона Полацкага называў «брамай сваёй вучонасці».

**1887** год — нарадзіўся (г. Брэст) Пётр Фёдаравіч Папковіч, вучоны ў галіне караблебудавання, член-карэспандэнт АН СССР, контр-адмірал-інжынер, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР. З 1908 года — у ВМФ. Дзейнасць звязана са шматлікімі галінамі развіцця тэхнікі і ўзбраення флоту. У 1934—1940 гадах — прафесар Ленінградскага караблебудаўнічага інстытута, з 1934-га — у Ваенна-марской акадэміі. Аўтар навуковых прац па будаўніцтве і механіцы карабля. Удзельнік праектавання першых савецкіх падводных лодак і выпрабаванняў некаторых з іх. Лаўрэат Сталінскай прэміі.

**1907** год — нарадзіўся (г. Мінск) Мікалай Аляксандравіч Сяліцкі, Герой Савецкага Саюза (1936). У Чырвонай Арміі з 1931 года. Удзельнік грамадзянскай вайны ў Іспаніі (1936—1939) на баку рэспубліканскага ўрада. Вызначыўся ў кастрычніку 1936-га ў баях каля населенага пункта Сесенья пад Мадрыдам. У цяжкіх умовах танкавы ўзвод пад камандаваннем лейтэнанта Сяліцкага знішчыў батарэю горных гармат, зайшоўшы ў тыл праціўніка, атакаваў варожыя рэзервы, якія падыходзілі, знішчыў некалькі аўтамашын і да двух узводаў пяхоты. Загінуў у баі.

**1972** год — на радзіме народнага паэта Беларусі Я. Купалы ў вёсцы Вязынка Маладзечанскага раёна заснаваны Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка». Адкрыты 10 ліпеня 1972 года да 90-годдзя з дня нараджэння паэта. Назву атрымаў ад былой сядзібы Вязынка, дзе сям'я Я. Купалы арандавала зямлю ў памешчыка С. Замбржыцкага ў 1881—1883 гадах.

**У свеце**

**1147** год — паводле летапісных крыніц, суздальскі князь Юрый Уладзіміравіч Далгарукі клікаў прыбыць да яго ў госці «в град Московъ» «на пачэсны баль» свайго саюзніка, северскага князя Святаслава Вольгавіча. Гэты дзень прынята лічыць датай заснавання расійскай сталіцы.

**1242** год — адбылося Лядовае пабоішча, перамога войскаў Аляксандра Неўскага над нямецкімі рыцарамі на Чудскім возеры. У бітве ўдзельнічалі атрады Полацкага і Віцебскага княстваў. Аляксандр Неўскі быў жанаты на дачцэ полацкага князя Брачыслава Аляксандры і падтрымліваў цесныя сувязі з гэтымі землямі.

**1722** год — экспедыцыя галандскага адмірала Якаба Рагевена адкрыла ў Ціхім акіяне востраў, названы вострам Пасхі.



**1818** год — у Парыжы барон Карл дэ Дрэз прадэманстраваў першы двухколавы сродак перамяшчэння (правобраз веласіпеда).

**1952** год — у «Литературной газете» быў апублікаваны артыкул пад загалоўкам «Кібернетыка — «навука» цемрашалаў», у якой кібернетыку абвясцілі лжэнавукай.

**1955** год — Уінстан Чэрчыль сышоў у адстаўку з пасады прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі.

**Так гаварыў...**

**ІВАН ТУРГЕНЕЎ:**

*«Празмерная гордасць — шыльда нікчэмнай душы».*

## УСМІХНЕМСЯ

Гэта тэкст-пастка. І ты дачытаеш яго да канца. Таму што падпарадкоўваешся маёй волі. Вось так. Яшчэ крыху. Выдатна. Табой так лёгка кіраваць.

**— Толькі што бачыў, як адзін малады чалавек спрабаваў пацалаваць тваю жонку.**
**— І гэта яму ўдалося?**
**— Не, не ўдалося.**
**— Значыць, гэта была не мая жонка.**

— Прывітанне, я табе яшчэ не надакучыла?
— Не, але ты вельмі мэтанакіраваная...

**— У яе дзве вышэйшыя адукацыі, яна цудоўна выхаваная і выдатна гатуе! Што табе не спадабалася?!**
**— Вусы...**

Як толькі знаходзіш сваю палоўку, вакол пачынаюць з'яўляцца іншыя палоўкі і прымушаюць цябе сумнявацца ў тым, што гэта твая.



## Месяц

***Маладзік 1 красавіка.***
***Месяц у сузор'і Блізнят.***

## Імяніны

***Пр.*** *Лідзіі, Настассі, Васіля, Генадзя, Дзмітрыя.*
***К.*** *Вінцэнты, Ірэны, Вінцэнта, Юльяна.*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 6.33 | 19.53 | 13.20 |
| Віцебск | — 6.21 | 19.44 | 13.23 |
| Магілёў | — 6.23 | 19.43 | 13.20 |
| Гомель | — 6.22 | 19.37 | 13.15 |
| Гродна | — 6.48 | 20.07 | 13.19 |
| Брэст | — 6.51 | 20.06 | 13.15 |

## ЗАЎТРА




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 964.
Нумар падпісаны ў 19.30 4 красавіка 2022 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12